Источник: "Настаўніцкая газета" - 2012-09-29



**Пра тое, як наладжана ўзаемадзеянне з сям'ёй у школах і гімназіях краіны, мы на прыкладах лепшага педагагічнага вопыту расказваем рэгулярна. А вось як выбудавана сістэма ўзаемадзеяння ў спецыяльных навучальных установах, там, дзе саюз бацькоў і настаўнікаў на карысць дзіцяці павінен быць асабліва моцным, мы раскажам на прыкладзе Маладзечанскай спецыяльнай школы-інтэрната № 2 для дзяцей з парушэннямі зроку.**

# Навучыць бачыць сэрцам

У школе-інтэрнаце вучацца і праходзяць лячэнне дзеці з паталогіяй зроку, у тым ліку невідушчыя дзеці, з усіх раёнаў Мінскай вобласці. Тут яны атрымліваюць агульную базавую і агульную сярэднюю адукацыю. Школа размяшчаецца ў трохпавярховым будынку, пабудаваным яшчэ ў 1964 годзе. Нягледзячы на ўнушальны ўзрост збудавання, тут абсталяваны вучэбныя кабінеты па ўсіх прадметах, працуюць майстэрні тэхнічнай і абслуговай працы, ёсць спартыўная і трэнажорная залы, відэасалон, музычная студыя, інфармацыйна-метадычны цэнтр, лінгафонны кабінет. Усе аўдыторыі ўкамплектаваны неабходным абсталяваннем і дазваляюць весці паўнацэнную вучэбна-выхаваўчую і карэкцыйную работу ў 13 класах-камплектах. Навучанне ўключае матэрыял як агульнага зместу, уласцівага масавай школе, так і спецыяльнага, карэкцыйнага, што дазволіць выпускнікам паспяхова будаваць самастойнае жыццё пасля заканчэння школы-інтэрната.

Не сакрэт, што на ўзровень жыццядзейнасці і сацыяльнай адаптацыі навучэнцаў з парушэннямі зроку ўплывае ступень безбар'ернасці навакольнага асяроддзя. У школе-інтэрнаце створаны ўсе ўмовы для арганізацыі адаптыўнай адукацыйнай прасторы. З мэтай забеспячэння навучэнцам з парушэннямі зроку больш вольнай і ўпэўненай арыенціроўкі ў школе выкарыстоўваюцца разнастайныя сігнальныя апоры: накіроўваючыя поручні, розныя фактуры паверхні падлогі (накіроўваючыя лініі, рэльефныя дыванкі, якія пазначаюць пачатак лесвіц), таблічкі шрыфтам Брайля, дубліруючыя назвы кабінетаў, тактыльныя пазнакі на поручнях, на дзвярах спальні для невідушчых навучэнцаў. Акрамя тактыльных, выкарыстоўваюцца і глядзельныя сігнальныя апоры: чырвоны колер першай і апошняй прыступкі, які пазначае пачатак лесвічных маршаў. Безбар'ернае асяроддзе дапамагае праводзіць заняткі па пераадоленні страху прасторы і навучанні самастойнаму перамяшчэнню навучэнцаў па сігнальных апорах і арыенцірах.

Асаблівай увагі заслугоўвае інфармацыйны цэнтр спецыяльнай школы. Аб'ектыўна гэта звычайны камп'ютарны клас на 12 вучнёўскіх месцаў з адпаведным праграмным забеспячэннем для вывучэння інфарматыкі і іншых вучэбных прадметаў. У той жа час усе камп'ютары аснашчаны спецыяльным праграмным забеспячэннем і абсталяваннем, прызначаным для арганізацыі адукацыйнага працэсу навучэнцаў з парушэннямі зроку: брайлеўскі дысплей на 40 знакаў; падручнікі, якія размаўляюць; праграмы для карэкцыі пазнавальнай дзейнасці малодшых школьнікаў; праграмы-трэнажоры для развіцця глядзельных функцый; праграмы для навучання чытанню. Усе камп'ютары падключаны да інтэрнэту. У школе-інтэрнаце актыўна выкарыстоўваецца сайт спецыяльнай адукацыі asabliva.by, на якім карыстальніку прапаноўваецца магчымасць павялічыць шрыфт і ўключыць гукавое суправаджэнне. Таксама ёсць вопыт правядзення анлайн-канферэнцый са Ждановіцкай спецыяльнай агульнаадукацыйнай школай-інтэрнатам для дзяцей з парушэннямі слыху. З дапамогай праграмы Skype штотыдзень атрымліваюцца кансультацыі ад спецыялістаў лабараторыі сінтэзу гаворкі Інстытута праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Вядзецца работа па наладжванні кантактаў з установамі адукацыі адпаведнага спецыяльнага профілю ў Расіі, Казахстане, Польшчы і Германіі.

У школе-інтэрнаце пяць гадоў працуе навуковае таварыства навучэнцаў "Пошук". За гэты кароткі тэрмін даследчыя праекты навучэнцаў школы паспяхова абараняліся на канферэнцыях даследчых работ розных узроўняў, у тым ліку рэспубліканскага і міжнароднага. У школе створаны ўмовы для развіцця творчых здольнасцей навучэнцаў. Дзейнічаюць гурткі танцаў, музыкі, роспісу па дрэве, тэхнічнай і абслуговай працы, фальклорная студыя і інш. Калектыў школы неаднаразова станавіўся лаўрэатам рэспубліканскага фестывалю мастацкай творчасці сярод навучэнцаў спецыяльных школ-інтэрнатаў "Вясёлкавы карагод".

У школе працуюць секцыі агульнай фізічнай падрыхтоўкі, настольнага тэнісу, рухавых гульняў, міні-футбола, шашак і шахмат. Вучні школы і яе выпускнікі дасягаюць высокіх вынікаў на рэспубліканскіх і міжнародных спаборніцтвах. Выпускнікі школы з гонарам працягваюць яе спартыўныя традыцыі. Сярод іх 11 чэмпіёнаў Еўропы, 10 чэмпіёнаў свету, 5 чэмпіёнаў Паралімпійскіх гульняў, 10 прызёраў гэтых спаборніцтваў.

— Існуе палажэнне Міністэрства адукацыі аб ажыццяўленні патранажу выпускнікоў спецыяльных устаноў адукацыі на працягу двух гадоў пасля выпуску. Нам нікога шукаць не трэба. Яны самі да нас прыязджаюць. Працягваюць зносіны з настаўнікамі, гутараць з сённяшнімі навучэнцамі школы-інтэрната. Сувязь установы адукацыі з вучнямі за гады вучобы і жыцця ў школе-інтэрнаце становіцца вельмі моцнай, — расказвае дырэктар Маладзечанскай спецыяльнай школы-інтэрната № 2 для дзяцей з парушэннямі зроку Наталля Леанідаўна Глінская.




У адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі суб'ектамі адукацыйных зносін з'яўляюцца не толькі педагогі, але і бацькі ці законныя прадстаўнікі навучэнцаў. Таму работа ўстановы адукацыі накіравана на актывізацыю дзейнасці бацькоў, на далучэнне іх да самакіравання, на канструктыўнае ўзаемадзеянне з настаўнікамі. Не першы год ва ўстанове адукацыі выбудоўваецца сістэма работы з бацькамі па наступных кірунках: вывучэнне сем'яў навучэнцаў, іх адукацыйных і інфармацыйных запатрабаванняў і запытаў; стварэнне ўмоў для ўключэння бацькоў у дзейнасць установы адукацыі як раўнапраўных суб'ектаў; выкарыстанне розных форм узаемадзеяння, напаўненне іх сучасным зместам; фарміраванне адзінай адукацыйнай прасторы, што спрыяе неканфліктнаму ўзаемадзеянню педагогаў, дзяцей і бацькоў.

Работа з сям'ёй ва ўстанове адукацыі выбудоўваецца таксама з улікам сацыяльна-педагагічнай характарыстыкі: усяго дзяцей у школе — 104, сем'яў — 74, няпоўных — 37, мнагадзетных — 10, малазабяспечаных — 9, сем'яў, у якіх выхоўваюцца дзеці-інваліды, — 60, добранадзейных — 57. Педкалектыў прыкладвае вялікія намаганні на ўключэнне бацькоў у выхаваўчы працэс. Гэтая работа асабліва актывізуецца ў перыяд правядзення тэматычных тыдняў: тыдня маці, сям'і, напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны, 8 Сакавіка. Кожны год у школе-інтэрнаце праводзяцца спартландыі "Тата, мама, я — спартыўная сям'я", спаборніцтвы па настольным тэнісе, валейболе, міні-футболе. Падчас такіх мерапрыемстваў школа-інтэрнат стварае ўмовы, калі і дзеці, і бацькі адчуваюць задавальненне ад зносін адно з адным. Вынікам шматгадовай работы школы-інтэрната з сям'ёй з'яўляецца адсутнасць дзяцей, якія маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, тут няма дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы ці на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх.

— Усе сем'і вельмі розныя. Работа з бацькамі ўвогуле нялёгкая, у школе-інтэрнаце яна няпростая з-за спецыфікі навучальнай установы, — расказвае намеснік дырэктара Уладзімір Іванавіч Барысаў. — Работа з імі праводзіцца па ўсіх кірунках, але асабліва адзначыў бы метадычнае суправаджэнне сям'і. Нярэдкія выпадкі, калі бацькі проста губляюцца і не ведаюць, што рабіць з дзіцем, у якога сур'ёзныя праблемы са зрокам. Мы мэтанакіравана рыхтуем інфармацыю і аб псіхалагічных аспектах паводзін бацькоў з такімі дзецьмі, вучым іх, як правільна рабіць урокі з дзецьмі, як увогуле правільна будаваць з імі зносіны. Перамены заўважныя. Калі раней бацькі прыязджалі ў школу-інтэрнат, уручалі дзецям цукеркі і ад'язджалі, то цяпер замест цукерак свайму дзіцяці ўсё часцей прывозіцца торт, арганізоўваюцца сямейныя гасцёўні за кубачкам чаю з іншымі бацькамі і дзецьмі.

Не застаюцца ўбаку бацькі і падчас арганізацыі грамадзянска-патрыятычнага выхавання навучэнцаў школы-інтэрната. Асабліва пасля таго, як у ім быў створаны музей "Памяць" аб воінах, што загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Дакладней, існаваў у навучальнай установе ён ужо даўно, але асаблівага інтарэсу ні для дзяцей, ні для бацькоў не ўяўляў. Але пасля таго, як з дапамогай бацькоў была створана новая экспазіцыя, музей атрымаў новае жыццё, пачалася актыўная пошукавая работа. Не застаюцца ўбаку бацькі і падчас мерапрыемстваў грамадзянска-патрыятычнай накіраванасці, якія не абыходзяцца без удзелу ў іх ветэранаў. Актыўны ўдзел бацькоў і ў фізкультурна-аздараўленчай рабоце, у штогадовых спартакіядах, спартландыях. Але было б памылкова думаць, што ва ўзаемадзеянні з бацькамі ўсё так цудоўна.

— Трэба адзначыць, што работа з бацькамі ў нас у параўнанні з масавай школай больш цяжкая. Здавалася б, дзяцей у нас вучыцца няшмат, але ў асноўным усе яны іншагароднія. І мы ўдзячныя бацькам, якія прыязджаюць да нас, каб паўдзельнічаць у школьных мерапрыемствах, — расказвае Уладзімір Іванавіч. — Мы актыўна прапагандуем не толькі тое, каб бацькі прыязджалі на выхадныя да дзяцей, былі тут з імі пэўны час падчас мерапрыемстваў, але і тое, каб на выхадных яны забіралі дзяцей дадому. Нягледзячы на цёплую атмасферу, якую мы стараемся стварыць у школе для дзяцей і бацькоў, для таго, каб пабыць разам, ім аб'ектыўна трэба больш часу, чым доўжыцца ўнутрышкольнае мерапрыемства. Трэба бачыць твар дзіцяці, якому патэлефанавалі і сказалі, што на гэтыя выхадныя за ім не прыедуць і не забяруць дадому. На жаль, ёсць у нас сем'і, з якімі яшчэ працаваць і працаваць. Бывае, што класныя кіраўнікі тэлефануюць бацькам яшчэ ў чацвер, нагадваючы, што хутка выхадныя. Рэдка, але бывае і такое, што бацькі прыязджаюць за дзіцем у нецвярозым стане, і мы ім дзіця проста не аддаём. Бацькі, можа, і часцей бы прыязджалі, калі б было не так далёка і дарага ў параўнанні са звычайная школай, якая нярэдка знаходзіцца праз дарогу ад дома. Але гэта спецыфіка работы школы-інтэрната.

Яшчэ адзін момант. Лагічна было б меркаваць, што работа з бацькамі ў школе-інтэрнаце ўскладнена яшчэ і тым фактам, што мам і татаў, у параўнанні са звычайнай школай, бачаць тут радзей з-за таго, што дзеці ў школе-інтэрнаце жывуць пастаянна і бацькі не прыходзяць, напрыклад, за самымі маленькімі школьнікамі пасля заняткаў. Адпаведна і больш складана наладзіць партнёрскі кантакт з бацькамі. Але намеснік дырэктара Маладзечанскай спецыяльнай школы-інтэрната № 2 для дзяцей з парушэннем зроку запэўніў: "Думаю, што зносіны з бацькамі мы маем нават большыя, чым у звычайных школах. У нас запатрабаванасць у гэтым значна большая. І калі мы можам бачыцца радзей, чым у масавай школе бачацца бацькі з настаўнікамі, то тэлефонную сувязь з падтрымліваем пастаянна. Сумны настрой дзіцяці як рукой знімае тэлефонны званок настаўніка бацькам і навіна аб тым, што дома ўсё добра".

— Катэгорыя бацькоў нашай установы адукацыі патрабуе асаблівай увагі. У тым ліку і таму, што практычна ўсе сем'і выхоўваюць дзіця-інваліда. І многія бацькі пераканаты, што ўсе ім нечым абавязаны. Мы стараемся данесці да іх не толькі тое, чым у такім выпадку ім можа дапамагчы дзяржава, але і нагадаць пра іх бацькоўскія абавязкі, — гаворыць Наталля Леанідаўна Глінская. — Канечне, з некаторых бацькоў вельмі складана зрабіць актыўных удзельнікаў выхаваўчага працэсу, але мы не стамляемся запрашаць іх, максімальна ўключаць у жыццё нашай навучальнай установы. Стараемся данесці да іх, што не менш важна бачыць сэрцам. Хаця б сваіх дзяцей. Ва ўсялякім разе мы на сваіх навучэнцаў глядзім менавіта сэрцам.

**Валерыя САНТЭРСКАЯ.**
**Фота БелТА.**

Валерыя Сантэрская. Навучыць бачыць сэрцам